# Агляд падзей тыдня паводле афіцыйных крыніц ЕС

Падзеі мінулага тыдня ........ 2

Сайт тыдня ........ 4

Фота тыдня ........ 5

Відэа тыдня ........ 5

## Анонсы падзей 14-20 мая

**14 мая** – у Брусэлі адбываецца сустрэча міністраў замежных спраў Еўрасаюза на чале з Высокім прадстаўніком ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан. На сустрэчы абмяркоўваецца сітуацыя ў Афганістане і падрыхтоўка да саміта НАТА ў Чыкага; працэс мірнага ўрэгулявання на Бліжнім Усходзе, праект Паўднёвага партнёрства з Лівіяй, Сірыяй і Алжырам; адносіны ЕС з Расіяй і Мексікай перад двухбаковымі самітамі з гэтымі краінамі; а таксама дамова аб асацыяцыі з Украінай напярэдадні сустрэчы па супрацоўніцтве ЕС-Украіна, што адбудзецца **15 мая**. Больш падрабязна і прэс-канферэнцыя па выніках сустрэчы (17.00)

**15 мая** – Еўракамісія прыме пакет дакументаў па Еўрапейскай палітыцы суседства на 2012 год. Пакет складаецца са справаздач, што ацэньваюць ажыццяўленне палітыкі суседства ў 2011 годзе ў 12 суседніх з Еўрасаюзам краінах, а таксама ўключае две рэгіянальныя прамежкавыя справаздачы, якія аналізуюць прагрэс у ажыццяўленні ініцыятывы “Ўсходняе партнёрства”. Больш інфармацыі і трансляцыя прэс-канферэнцыі

**18-19 мая –** Еўрасаюз прыме ўдзел у саміце Вялікай васьмёркі ў Кэмп-Дэвідзе (ЗША). З ЕС на саміт прыедуць прэзідэнт Еўрапейскай Камісіі Барозу і прэзідэнт Еўрапейскага Савета Херман ван Рампёй. Больш падрабязна

## Падзеі мінулага тыдня

### Пасланне Еўракамісіі ў Дзень Еўропы: час вырашаць

Эканамічныя праблемы сталі галоўнай тэмай сёлетняга паслання Еўрапейскай Камісіі з нагоды Дня Еўропы. Моцныя стабілізацыйныя механізмы прадухілілі крэдытны крызіс, адзначаецца ў пасланні, але без далейшых рашучых дзеянняў Еўрасаюз можа разлічваць толькі на слабы рост у другой палове бягучага года. Таму Камісія заклікае краіны Саюза аб’яднаць намаганні для выканання прапанаванай стратэгіі развіцця да 2020 года, што дапаможа распачаць эканамічны рост і стварыць новыя працоўныя месцы.

### Першая грамадзянская ініцыятыва зарэгістраваная ў Дзень Еўропы

Еўрапейская Камісія адзначыла Дзень Еўропы рэгістрацыяй першай Еўрапейскай грамадзянскай ініцыятывы пад назвай “Братэрства 2020 – Мабільнасць, Прагрэс, Еўропа”. Прапанова распрацаваная грамадзянамі Аўстрыі, Бельгіі, Венгрыі, Італіі, Люксембурга, Румыніі і Гішпаніі. Яе галоўная мэта – пашырэнне праграм абменаў у ЕС, такіх як “Эразмус” ці “Еўрапейскі валанцёрскі сэрвіс”, каб садзейнічаць аб’яднанню Еўропы праз выхаванне салідарнасці паміж яе жыхарамі.

### Еўрапарламент ухваліў абмежаванне кошту роўмінгу ў Еўрасаюзе

Еўрапейскі Парламент ухваліў новыя правілы мабільнага роўмінгу ў ЕС. Новыя правілы таксама дазволяць купляць паслугі роўмінгу ў іншых аператараў сувязі і адкрыюць рынак для новых кампаній. Па ацэнках экспертаў, гэтыя захады дапамогуць еўрапейскім сем’ям штогод эканоміць каля 200 еўра.

### Еўракамісія ўзмацняе прамысловае супрацоўніцтва з ЗША

Віцэ-прэзідэнт Еўракамісіі Антоніа Таяні разам з генеральнымі дырэктарамі асноўных прамысловых прадпрыемстваў ЕС з 10 па 12 мая наведаў Злучаныя Штаты Амерыкі. Галоўнай мэтай візіта стала ўзмацненне прамысловага супрацоўніцтва і гандлёвых адносінаў паміж ЕС і ЗША, каб дапамагчы еўрапейскай і амерыканскай эканомікам аднавіць эканамічны рост і стварыць новыя працоўныя месцы ў межах трансатлантычнага рынка.

### Еўрапарламент заклікае падтрымаць дэмакратыю ў арабскіх краінах праз гандаль

Еўрапарламентарыі ўхвалілі прапанову змяніць гандлёвую палітыку ў краінах Паўднёвага Міжземнамор’я. Дэпутаты лічаць, што краіны Еўрасаюза павінны падтрымліваць пераход

да дэмакратыі ў краінах арабскай вясны праз дапамогу малому і сярэдняму бізнесу, які забяспечвае працай да 30% насельніцтва, з’яўляецца рухавіком росту матэрыяльнага дабрабыту і пагрозай для ўлады мясцовых алігархаў.

### Дасягнутае больш амбітнае міжнароднае пагадненне па зніжэнні ўзрознію забруджвання паветра

Абноўлены Гётэборгскі пратакол вызначае больш амбітныя мэты па пераадоленні забруджвання паветра. Згодна новым стандартам, краіны ЕС у параўнанні з 2005 годам павінны на 60% скараціць выкіды аксідаў серы і на 40% - аксідаў азота, а таксама прыняць захады па барацьбе з тэхнічным вугляродам, які мае хуткі ўплыў на змяненне клімата.

### Эканамічны прагноз 2012-2013гг.: на шляху да павольнага аднаўлення

Еўракамісія 11 мая прадставіла эканамічны прагноз на 2012-2013 гг. Пасля цяперашняй рэцэсіі павольнае аднаўленне эканомікі чакаецца ў другой палове бягучага года. Валавы ўнутраны прадукт Еўрасаюза застанецца ў 2012 на адным узроўні з мінулым годам, а ў еўразоне чакаецца скарачэнне гэтага паказчыка на 0.3%. У наступным годзе рост эканомікі зоны еўра складзе 1%, а ў ЕС цалкам – 1.3%. Беспрацоўе застанецца высокім – 10% у 27 краінах ЕС і 11% у 17 краінах зоны еўра.

### Еўрапейскі фонд фінансавай стабільнасці пацвердзіў выдзяленне сродкаў для Грэцыі

Еўрапейскі фонд фінансавай стабільнасці (ЕФФС) 9 мая пацвердзіў выдзяленне Грэцыі 5.2 млрд. еўра з першага транша ў памеры 39.4 млрд. еўра да канца чэрвеня. 4.2 млрд. еўра ўжо былі пералічаныя Грэцыі ў чацвер 10 мая, а астатні мільярд будзе выдаткаваны краіне ў чэрвені ў залежнасці ад фінансавых патрэбаў на той момант.

### Праграма ЕС “Эразмус” усталявала рэкорд па колькасці студэнцкіх абменаў

Праграма Еўрасаюза “Эразмус” усталявала рэкорд па гадавым росце колькасці студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у праграмах абмена. У 2010-11 гг. у параўнанні з мінулым акадэмічным годам колькасць студэнтаў вырасла на 8.5% і за ўвесь час існавання праграмы дасягнула больш як 230 тыс. чалавек. Найвялікшы рост колькасці студэнтаў-удзельнікаў праграмы “Эразмус” назіраўся ў Харватыі (132%).

### Сан-Себасцьян і Вроцлаў абвешчаныя Еўрапейскімі сталіцамі культуры 2016

Савет ЕС перадаў тытулы Еўрапейскіх сталіц культуры 2016 года Сан-Себасцьяну (Гішпанія) і Вроцлаву (Польшча). Сёлета еўрапейскімі сталіцамі культуры з’яўляюцца

Гімарайнш (Партугалія) і Марыбор (Славенія). Чакаецца, што ў ліпені гэтага года Еўракамісія прадставіць прэтэндэнтаў на тытулы еўрапейскіх сталіц культуры наступнага дзесяцігоддзя.

### Эштан і Фюле вітаюць выбары ў Арменіі і заклікаюць выправіць недахопы

Высокі прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан і камісар па справах пашырэння і еўрапейскай палітыцы суседства Штэфан Фюле вітаюць парламенцкія выбары ў Арменіі, у выніку якіх шэсць палітычных партый атрымалі месцы ў Нацыянальнай асамблеі. Аднак прадстаўнікі ЕС звярнулі ўвагу на недахопы, выяўленыя АБСЕ, і заклікалі армянскія ўлады выправіць недахопы падчас прэзідэнцкіх выбараў у 2013 годзе.

### Сайт тыдня

Другая штогадовая канферэнцыя “The State of the Union”, што адбылася ў Фларэнцыі падчас святкавання Дня Еўропы

### Фота тыдня

У Дзень Еўропы самы высокі хмарачос Нью-Йорка Empire State Building набыў колеры сцяга ЕС

### Відэа тыдня

Афіцыйная заява Высокага прадстаўніка ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан з нагоды Дня Еўропы

*Агляд падрыхтаваны Цэнтрам еўрапейскіх даследванняў для Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі*